ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
30 01 2014 г.

Абмяркуем

ЦІ ЁСЦЬ БУДУЧЫНЯ Ў СТУДЭНЦКАГА САМАКІРАВАННЯ?

Калі ў адным з нарвежскіх універсітэтаў адміністрацыя паспрабавала закрыць праграму «Антрапалогія», студэнцкі парламент універсітэта, вывучыўшы меркаванні ўсіх зацікаўленых бакоў, змог адмяніць непапулярнае рашэнне адміністрацыі. У прынцыпе, у тым, што студэнты актыўна адстойваюць сваю пазіцыю, няма нічога дзіўнага для еўрапейскіх краін, дзе студэнцкае самакіраванне стала эфектыўным механізмам абароны інтарэсаў студэнтаў. Дзякуючы студэнцкаму самакіраванню адміністрацыя разгружаецца ад вялікай колькасці пытанняў, вырашэнне якіх бяруць на czбе студэнты. Да таго ж інфармацыю аб праблемах, што хвалююць студэнтаў, кіраўніцтва атрымлівае з самых першых рук.

У беларускіх ВНУ першыя арганізацыі студэнцкага самакіравання пачалі з'яўляцца яшчэ напрыканцы 1980-х гадоў — «для дэмакратызацыі вышэйшай адукацыі СССР». Цяпер структуры студэнцкага самакіравання створаны практычна ва ўсіх вышэйшых навучальных установах, аднак ці стала студэнцкае самакіраванне рэальнай сілай, з якой лічыцца і да якой прыслухоўваецца ўніверсітэцкая адміністрацыя?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Заканадаўчыя прабелы

Сістэма органаў студэнцкага самакіравання ў беларускіх ВНУ адрозніваецца і па структуры, і па паўнамоцтвах. Даволі папулярнай мадэллю з'яўляюцца студсаветы. Напрыклад, студэнцкі савет Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта складаецца з двух узроўняў прадстаўніцтва — факультэцкага і ўніверсітэцкага. Студсавет дзейнічае таксама і ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, аднак там універсітэцкі ўзровень прадстаўлены ў выглядзе своеасаблівай Каардынацыйнай рады кіраўнікоў факультэцкіх арганізацый. Студэнцкі рэктарат/дэканат дзейнічае ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце. У Бедзяржуніверсітэце дзейнічаюць Студэнцкі саюз БДУ (адзіны ў Беларусі орган студэнцкага самакіравання са статусам юрыдычнай асобы), студэнцкі савет па якасці адукацыі, саветы старастаў і г. д.

У 2012–2013 гадах студэнцкімі актывістамі было створана Братэрства арганізатараў студэнцкага самакіравання, якое аб'яднала лідараў студэнцкага самакіравання з большасці ВНУ. **Адным з яго заснавальнікаў і першым кіраўніком стаў выпускнік юрыдычнага факультэта і аспірантуры БДУ Сяргей ВАРАНКЕВІЧ, эксперт у пытаннях студэнцкага самакіравання.**

— Адна з задач асацыяцыі заключаецца ў рэфармаванні і развіцці ў краіне студэнцкага самакіравання. Сёння арганізацыі студэнцкага самакіравання не маюць статусу юрыдычнай асобы (выключэнне складае толькі Студэнцкі саюз БДУ), а значыць, у прававым плане яны залежаць ад адміністрацыі ўніверсітэта, — тлумачыць Сяргей Варанкевіч. — Увогуле, Кодэкс аб адукацыі змяшчае недастаткова канкрэтныя фармулёўкі, якія датычацца правоў студэнтаў на іх удзел у кіраванні сваёй ВНУ, і абмяжоўвае дзеянні студэнтаў у параўнанні з нормамі ранейшага Закона «Аб вышэйшай адукацыі».

Так, закон «Аб вышэйшай адукацыі» абвяшчаў удзел студэнтаў у кіраванні вышэйшай навучальнай установай у парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і статутам вышэйшай навучальнай установы; стварэнне і выбранне органаў студэнцкага самакіравання, аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, моладзевыя і іншыя грамадскія аб'яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Кодэкс аб адукацыі, у сваю чаргу, дазваляе студэнтам удзел у кіраванні ўстановай адукацыі і ўдзел у прафесійных саюзах, моладзевых і іншых грамадскіх аб'яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству.

— Калі ўважліва параўнаць фармулёўкі, цяпер студэнтам дадзена права **не аб'ядноўвацца ў моладзевыя і грамадскія арганізацыі, а толькі ўдзельнічаць у іх,** — падкрэслівае Сяргей Варанкевіч. — Другім паказальным момантам звужэння прававых магчымасцяў для стварэння і функцыянавання арганізацый студэнцкага самакіравання ва ўніверсітэтах з'яўляецца **поўнае знікненне з Кодэкса такога паняцця, як «студэнцкае самакіраванне».** Права студэнтаў на кіраванне вышэйшымі навучальнымі ўстановамі ў дзейным заканадаўстве не ўрэгулявана, а такі механізм, як студэнцкае самакіраванне, і ўвогуле не прапісаны. З-за адсутнасці прадстаўніцкіх функцый студэнцкае самакіраванне фактычна бяспраўнае ў вырашэнні пытанняў, якія тычацца студэнтаў.

Фінансавая залежнасць

Згодна з Кодэксам, саветы ВНУ — асноўныя органы самакіравання ўстаноў вышэйшай адукацыі. Аднак у беларускіх ВНУ на саветы не ўскладзены той шырокі спектр пытанняў самакіравання, якія вырашаюцца саветамі еўрапейскіх універсітэтаў. Саветы беларускіх універсітэтаў не ўдзельнічаюць у кіраванні ўніверсітэтам, а толькі з'яўляюцца калегіяльным дарадчым органам, саветы не ўпаўнаважаны прымаць канчатковыя рашэнні па пытаннях вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай, інфармацыйнай работы, не вырашаюць ніякіх фінансавых пытанняў і г. д. Згодна з Палажэннем аб Саветах устаноў адукацыі, 25% саставу саветаў павінны складаць прадстаўнікі навучэнцаў. Вось толькі на практыцы гэта патрабаванне не выконваецца… І, паколькі студэнты пазбаўлены магчымасці ўдзельнічаць у выпрацоўцы рашэнняў, яны не могуць спыніць наступ на свае інтарэсы на стадыі, калі гэта зрабіць прасцей за ўсё…

Што да фінансавай незалежнасці органаў студэнцкага самакіравання, то яна таксама нідзе не занатавана. Для прыкладу, ва ўкраінскіх ВНУ фінансавай асновай студэнцкага самакіравання з'яўляюцца сродкі ў памеры не менш як 0,5 працэнта ад сродкаў спецыяльнага фонду ВНУ.

У Літве органы студэнцкага самакіравання фінансуюцца з бюджэтаў універсітэтаў, паколькі, згодна з законам аб адукацыі і навуцы, універсітэты абавязаны іх падтрымліваць. Дадатковымі крыніцамі фінансавання з'яўляюцца сродкі, выручаныя ад выдачы студэнцкіх білетаў, рэкламы, арганізацыі мерапрыемстваў, гранты, ахвяраванні і спонсарская падтрымка.

— Паколькі ў Беларусі органы студэнцкага самакіравання не валодаюць статусам юрыдычнай асобы, яны пазбаўлены магчымасці прыцягнення спонсарскай дапамогі, атрымання ахвяраванняў і ўзносаў, а таксама паступленняў ад праведзеных мерапрыемстваў. А фінансавая залежнасць абумоўлівае залежнасць арганізацыйную: фактычна органы студэнцкага самакіравання фінансава залежныя ад адміністрацый і дзяржаўных грамадскіх арганізацый, што, безумоўна, з'яўляецца іх слабым бокам, — разважае Сяргей Варанкевіч.

Цяжкая ноша лідара

Цяпер што датычыцца лідарскага патэнцыялу органаў студэнцкага самакіравання. Як правіла, у студэнцкія саветы выбіраюцца студэнты 2–3 курсаў, і іх актыўнасць доўжыцца да выпускнога курса, калі на першы план выходзяць «дарослыя» клопаты аб размеркаванні, працаўладкаванні, жыллі, сям'і і гэтак далей. Такім чынам, сярэдні перыяд актыўнай работы ў студэнцкім самакіраванні складае 2–3 гады, гэта значыць, што перыяд ратацыі вельмі кароткі. Ускладняе праблему і пераход большасці спецыяльнасцяў з гэтага навучальнага года на чатырохгадовы тэрмін навучання.

— Лідары, якія толькі асвоіліся на пасадах старшыняў студсаветаў і праф-бюро, наладзілі работу гэтых органаў, сабралі каманду аднадумцаў, пакідаюць свае пасады і «забіраюць» свае веды і досвед, — канстатуе Сяргей Варанкевіч. — Мала каму ўдаецца падрыхтаваць новае пакаленне лідараў і забяспечыць такім чынам пераемнасць. А навабранцы амаль нічога не ведаюць ні аб прынцыпах работы органаў студэнцкага самакіравання, ні аб іх задачах. Ім цяжка даюцца перамовы з адміністрацыяй ВНУ і факультэтаў. Змястоўная частка прапаноў прадстаўнікоў студэнцкага самакіравання таксама «кульгае». Яны абыходзяць бокам большасць «прыземленых» студэнцкіх праблем: працаўладкаванне, самарэалізацыю, бытавыя пытанні. Многія з актывістаў апраўдваюцца тым, што ў іх няма рэсурсаў на рэалізацыю праектаў у гэтых сферах…

Права студэнтаў на кіраванне вышэйшымі навучальнымі ўстановамі ў дзейным заканадаўстве не ўрэгулявана, а такі механізм, як студэнцкае самакіраванне, і ўвогуле не прапісаны.

Паколькі ў бліжэйшы час у дзейны Кодэкс аб адукацыі будуць уносіцца дапаўненні і карэкціроўкі, актывісты студэнцкага самакіравання сфармулявалі свае прапановы:

1. Унесці ў Кодэкс дапаўненне аб тым, што студэнцкае самакіраванне з'яўляецца прадстаўніком студэнтаў у працэсе кіравання ўстановай вышэйшай адукацыі, а таксама норму аб удзеле прадстаўнікоў студэнцкага самакіравання ва ўсіх органах, чые рашэнні закранаюць правы і інтарэсы навучэнцаў.

2. Замацаваць у Кодэксе аб адукацыі прынцып аўтаноміі студэнцкага самакіравання.

3. Унесці ў Кодэкс дапаўненне аб праве органаў студэнцкага самакіравання набыць статус юрыдычнай асобы — студэнцкага грамадскага аб'яднання, якое самастойна адказвае за сваю дзейнасць.

4. Унесці ў Кодэкс аб адукацыі дапаўненне аб выдзяленні на фінансаванне студэнцкага самакіравання пэўнай долі ад бюджэту ВНУ. Прапануецца выдаткоўваць 1 працэнт ад гадавога бюджэту ўстановы вышэйшай адукацыі.

5. Занатаваць у Кодэксе дакладную структуру органаў студэнцкага самакіравання.

6. Занатаваць правы і абавязкі ўдзельнікаў студэнцкага самакіравання.

— У нас з'явілася магчымасць запоўніць прабелы ў заканадаўстве, і мы спадзяёмся, што нашы ініцыятывы знойдуць падтрымку. Да таго ж слабасць студэнцкага самакіравання перашкаджае далучэнню Беларусі да Балонскага працэсу, — падсумаваў Сяргей Варанкевіч.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Старт кар'еры

ВУЧЫЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ — МАГЧЫМА!

Напрыканцы мінулага года сацыёлагі з НІСЭПІ (Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў) прэзентавалі даклад пад назвай «Моладзь Беларусі на рынку працы і ў сістэме працоўных стасункаў». У ім згадваюцца лічбы, якія прымушаюць задумацца. Так, больш за 81 працэнт маладых беларусаў хацелі б мець уласны бізнес праз 10 гадоў, пры тым, што многія з іх сёння з'яўляюцца… беспрацоўнымі. Сярод галоўных прычын, па якіх моладзь не ідзе працаваць, называюцца нізкія, па яе меркаванні, заробкі і адсутнасць на рынку той працы, якая б яе цікавіла. Менавіта пошукам вырашэння праблемы моладзевага працаўладкавання быў прысвечаны форум «Праца як яна ёсць», праведзены нядаўна ў Інстытуце журналістыкі БДУ. Арганізатарамі выступілі клуб «БРІВ» і Студэнцкі саюз БДУ.

Клуб «БРІВ» (Бізнес. Развіццё. Інфармацыя. Веды.) існуе з 2007 года. Ідэя яго стварэння належыць Студэнцкаму саюзу БДУ. Галоўныя мэты клуба — гэта дадатковая падрыхтоўка студэнтаў па асновах прадпрымальніцкай дзейнасці, дапамога ў працаўладкаванні студэнтаў, стварэнне магчымасцяў для абмену інфармацыяй і ведамі паміж удзельнікамі клуба.

— За час свайго існавання клуб правёў вялікую колькасць мерапрыемстваў, аднак у 2011 годзе адбылася змена саставу арганізатараў і… актыўнасць значна знізілася, — распавяла **кіраўнік клуба «БРІВ», студэнтка 3 курса Інстытута журналістыкі БДУ Таццяна МАТУСЕВІЧ.** — Летась у кастрычніку нашымі намаганнямі дзейнасць клуба была адноўлена. Літаральна за паўтара месяца мы распрацавалі праграму форуму «Праца як яна ёсць» — і вось яе вынік. Заяўкі на ўдзел у форуме падалі 140 чалавек, але, на жаль, мы змаглі пацвердзіць удзел толькі для 80 — з-за абмежаванай умяшчальнасці аўдыторый.

Удзельнікі былі размеркаваны на тры секцыі. Вядучымі першай сталі спецыялісты сферы HR (ад англійскага human resources — літаральна «чалавечыя рэсурсы»): два прадстаўнікі прыватных кадравых агенцтваў і супрацоўнік дзяржаўнай службы занятасці. Сярод найбольш перспектыўных спецыяльнасцяў імі называлася, у першую чаргу, праграмаванне. Менавіта ў гэтай сферы цяпер адчуваецца моцны недахоп высокакваліфікаваных кадраў. Усе вядучыя сышліся на адной думцы: сучасная моладзь часцей за ўсё вельмі сябе пераацэньвае, хоча мець «усё і адразу». Вакансіі з пазнакай «старт кар'еры» і невысокім заробкам рэдка знаходзяць водгук. Па меркаванні спецыялістаў, менавіта з такіх прыступак і трэба распачынаць сваю кар'еру маладым спецыялістам, звяртаючы ўвагу на перспектывы росту.

Тэмай другой секцыі было выяўленне ў яе ўдзельнікаў псіхалагічных схільнасцяў да розных прафесій. Вядучымі былі спецыялісты па падборы персаналу з прыватных кадравых агенцтваў.

На трэцяй секцыі выступалі маладыя людзі, якія адкрылі ўласную справу ў студэнцкія гады. Яны дзяліліся з аўдыторыяй сваім досведам, давалі канкрэтныя парады. Пасля перапынку для ўсіх удзельнікаў працавала адна вялікая секцыя. Разглядаліся правілы напісання рэзюмэ, сакрэты паспяховай гутаркі. Асобным вялікім блокам праходзіла выступленне спецыялістаў у прававой сферы. Асаблівую ўвагу яны звярталі на правілы размеркавання і магчымасць сумяшчэння працы і вучобы ў ВНУ. Пасля на гэтую ж тэму сваімі сакрэтамі дзяліліся студэнты БДУ, МДЛУ і БДУІР, якія атрымлівалі вышэйшую адукацыю паралельна з працай.

Сваімі ўражаннямі пасля закрыцця форуму зноў падзялілася Таццяна Матусевіч:

— Якія водгукі? Напрыклад, «я зрабіў бы зусім інакш» — з падрабязным апісаннем. Многія ўдзельнікі прапанавалі сваю дапамогу ў арганізацыі будучых мерапрыемстваў. Некалькі чалавек прасілі кантакты спікераў для далейшых зносін, хтосьці прапаноўваў свае цікавыя тэмы для новых сустрэч… Думаю, усе ўдзельнікі змогуць упэўнена сцвярджаць: вучыцца і працаваць — магчыма. У любым выпадку, добра, што ёсць зваротная сувязь. Неўзабаве мы правядзём яшчэ некалькі падобных мерапрыемстваў: у сярэдзіне лютага чатырохгадзінны трэнінг на развіццё памяці, у пачатку сакавіка — бізнес-гульню. Пасля гэтага будзем праводзіць вялікі двухдзённы форум.

Трапіць на мерапрыемствы клуба «БРІВ» можа кожны ахвотны. Для гэтага трэба сачыць за абнаўленнямі суполкі клуба ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» або на сайце briz.bsu.by.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.